# Сустрэчы таварышоў Панамарэнка П. К. і Кавалёва М. П. са сваімі выбаршчыкамі

БАРАНАВІЧЫ, 16 сакавіка. (БЕЛТА). 16 сакавіка прасторную залу гарадскога тэатра запоўнілі сотні працоўных. Тут адбылася сустрэча выбаршчыкаў са сваім кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР, членам ЦК ВКП(б), сакратаром ЦК КП(б)Б, членам Ваеннага Совета БАВА, ордэнаносцам Панцелеймонам Кандрацьевічам Панамарэнка.

Сход адкрывае старшыня абласнога выканаўчага камітэта тав. Царэнка.

Слова прадастаўляецца кандыдату ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР ад Баранавіцкай выбарчай акругі № 606 тав. Панамарэнка Панцелеймону Кандрацьевічу.

Цёпла сустрэты прысутнымі тав. Панамарэнка гаворыць яркую прамову, прасякнутую пачуццямі совецкага патрыятызма, бязмежнай любві да радзімы, да вялікага Сталіна. Ён горача дзякуе выбаршчыкаў за аказанае яму вялікае давер'е і абяцае яго па-большэвіцку апраўдаць.

У зале раздаюцца бурныя апладысменты, калі тав. Панамарэнка гаворыць аб вялікім вызваленчым паходзе па вызваленню працоўных Заходняй Беларусі з-пад панскага гнёту, пра клопаты вялікага Сталіна аб росквіце культурнага і заможнага жыцця працоўных заходніх абласцей БССР.

Слова прадастаўляецца машыністу паравознага дэпо станцыі Баранавічы тав. Філімонаву. Ён гаворыць аб радасці вызваленага народа, які ў гістарычны дзень 24 сакавіка аднадушна пойдзе да выбарчых урнаў і аддасць свае галасы за лепшых сыноў і дочак народа.

— Панцелеймон Кандрацьевіч Панамарэнка наш дастойны кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, — гаворыць тав. Філімонаў. — Рабочыя дэпо, вылучаючы кандыдатуру тав. Панамарэнка, заявілі, што ўсе яны як адзін аддадуць за яго свае галасы. І кожны з нас, горды сваёй социялістычнай радзімай, 24 сакавіка з радасцю выканае свой грамадзянскі доўг.

Выступае селянін Слонімскага раёна тав. Баравік.

— Тав. Панамарэнка верны сын працоўнага народа, — гаворыць тав. Баравік. — Толькі дзякуючы совецкай уладзе тав. Панамарэнка атрымаў вышэйшую адукацыю, стаў дзяржаўным дзеячом ленінска-сталінскага тыпу. Тав. Панамарэнка блізкі і дарагі інтарэсы народа. Мы ўпэўнены, што ён па-большэвіцку будзе клапаціцца пра нашы інтарэсы.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы